***С.В. Матвейчык,*** *выкладчык*

# РАЗВІЦЦЁ ТРАДЫЦЫЙНАГА ТКАЦТВА І ВЫШЫЎКІ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

У сучаснай культуры роля народнага мастацтва надзвычай актуалізуецца ў сувязі з працэсамі глабалізацыі, якія ставяць кожны народ перад неабходнасцю ўсведамлення сябе духоўнай цэласнасцю.

Глабалізацыя – гэта ўзрастанне ролі знешніх фактараў (эканамічных, сацыяльных, культурных) у народнай гаспадарцы ўсіх краін – удзельніц гэтага працэсу, фарміраванне адзінага сусветнага рынку без нацыянальных бар’ераў. Гэта эканамічная ўзаемасувязь краін свету ў выніку пастаяннага росту аб’ёму і разнастайнасці міжнароднага перамяшчэння тавараў, паслуг і інтэрнацыянальных патокаў капіталу, а таксама ўсё больш хуткае і шырокае распаўсюджванне тэхналогіі.

Сусветная культура каштоўная лакальнымі, рэгіянальнымі, нацыянальнымі, этнічнымі адрозненнямі. Шматлікасць культур складвалася ва ўмовах адноснай адасобленасці розных рэгёнаў планеты. Але ў працэсе развіцця грамадства ўзмацнялася ўзаемадзеянне культур. Дыялог культур адбываўся яшчэ ў глыбокай старажытнасці, узаемаўплыў культур увесь час узрастаў. Выпрацаваная ў працэсе гісторыка-культурнага развіцця разнастайнасць формаў дзейнасці, мыслення, бачання свету ўсё ў большай ступені ўключалася ў агульны працэс развіцця сусветнай культуры. Навукова-тэхнічны прагрэс, які закрануў у першую чаргу прамысловую вытворчасць, сродкі транспарту і сувязі, агульныя тэндэнцыі ў развіцці адукацыі, вялікая рухомасць насельніцтва, сусветны падзел працы – усё гэта фактары, якія аказваюць уздзеянне на культуру і грамадскае жыццё ў кірунку іх інтэрнацыяналізацыі. Апошняя вядзе да ўзмацнення і паглыблення ўзаемадзеяння і ўзаемапранікнення культур, да развіцця інтэграцыйных працэсаў, але таксама нараджае разнастайныя супярэчнасці, паколькі і характар, і вынікі працэсу ўзаемадзеяння культур шмат у чым залежаць ад сацыяльных умоў.

Тэма захавання культурнай адметнасці ва ўмовах глабалізацыі шырока абмяркоўваецца ў навуковым, палітычным, журналісцкім асяроддзі. У рамках гэтай тэмы закранаецца важнае пытанне не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супрацьпастаўлення глабальных працэсаў культурнай шматлікасці, а магчымасці адначасовага суіснавання [3, с. 20]. Праблема бачыцца не ў знішчэнні і знікненні культурнай шматлікасці пад уплывам глабальных працэсаў, а ў разыходжанні паміж імкненнем удзельнікаў геапалітычных адносін да павышэння эфектыўнасці сацыяльных узаемадзеянняў і камунікацый, з аднаго боку, і да захавання ўласнай культурнай ідэнтычнасці – з другога. Рацыянальнае асэнсаванне гэтага разыходжання дапаможа знайсці магчымасць сумяшчэння абедзвюх арыентацый.

Базавыя паняцці беларускага нацыянальнага менталітэту знайшлі адлюстраванне ў традыцыйным прыкладным мастацтве, у якім менавіта народнае ткацтва і вышыўка маюць бясцэннае значэнне для ўсёй нацыі і неабходны для захавання гістарычнай і мастацкай памяці.

Якім жа чынам глабалізацыя ўплывае на старажытнае народнае мастацтва ткацтва? У ткацтве XI–XII стст. на Беларусі ўжо выкарыстоўвалі шоўк і залачоныя ніткі, якія траплялі на тэрыторыю старажытных гарадоў Турава, Бярэсця, Навагрудка з Візантыі. Баваўняныя ніткі распаўсюдзіліся на Беларусі ў XVII ст., яны прывозіліся з Крыма і Турцыі праз Украіну [2, с. 55]. У выніку інтэграцыйных працэсаў і мадэрнізацыі ў культуры і эканоміцы з’явіліся новыя тэхнікі, малюнкі арнаментаў, прыёмы дэкарыравання вырабаў, нетрадыцыйныя віды сыравіны (прывазны шоўк, бавоўна, вырабляемыя прамысловым спосабам штучныя і сінтэтычныя валокны: віскоза, нітрон, поліэфір, поліамід), што значна змяніла каляровую гаму і якасць тканых вырабаў. Усё гэта адбілася на асартыменце, спосабе вытворчасці, эстэтычным выглядзе традыцыйных тканых і вышываных рэчаў, садзейнічала знікненню рэгіянальных і лакальных асаблівасцей у канцы XIX – пачатку XX ст. У сялянскім асяроддзі распаўсюдзіліся новыя матэрыялы: палатно фабрычнага вырабу, баваўняныя ніткі featured рознага колеру, кнігі з узорамі для вышывання і вязання кручком. Як адзначае даследчык народнай творчасці В.А.Лабачэўская, “ручнікі розных рэгіёнаў Беларусі набываюць у гэты перыяд падабенства, уніфікуюцца ў сваіх мастацка-стылістычных рысах. У іх паўтараюцца адны і тыя ж малюнкі, выявы, якія ў лепшым выпадку перапрацоўваюцца згодна з мясцовымі традыцыямі і густам выканаўцы” [1, с. 200].

Як прыклады ўплыву культуры і эканомікі суседніх краін можна ўзгадаць бракараўскія і кралявецкія ручнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Знакамітыя бракараўскія ўзоры – цэлы кірунак у дэкаратыўнай вышыўцы, які ўзнік дзякуючы размяшчэнню ўзораў вышыўкі на рэкламных лістках парфумерна-касметычнай фабрыкі “Брокар і К”. Заснаваная ў 1864 г. у Маскве французам Генрыхам Брокарам невялікая мылаварня рабіла стаўку на самага шырокага спажыўца. Насыціўшы сваёй прадукцыяй горад, Брокар пераключыўся на сельскае насельніцтва. Яго камерцыйны поспех таго часу – таннае мыла “сельскае” ў абгортцы, якое разносілі па вёсках карабейнікі. Да 1880-х гг. мылаварня перарасла ў буйную фірму, што гандлявала па ўсёй краіне. Гатункі мыла “сельскае”, “рускае”, “нацыянальнае”, якія мелі яркія абгорткі з надрукаванымі схемамі ўзораў для вышыўкі крыжыкам у так званым рускім стылі, карысталіся асаблівым поспехам. Дзякуючы гэтаму ў другой палове XIX ст. у сялянскім асяроддзі распаўсюдзілася вышыўка крыжыкам. Прапанаваныя фірмай Брокара матывы арнаментаў успрымаліся як “сапраўдныя народныя”, паколькі браліся мастакамі з народных узораў Расіі.

Кралявецкія ручнікі – вырабы ткацкай мануфактуры ў г. Кралявец Чарнігаўскай губерні. На Беларусі былі шырока распаўсюджаны ў канцы XIX – пачатку XX ст. у выніку гандлю гэтымі вырабамі і іх вялікай папулярнасці сярод сялянства. Уплыў кралявецкіх ручнікоў можна бачыць у ткацтве Цэнтральнай Беларусі і Падняпроўя. Капыльскія і рагачоўскія тыпы ручнікоў таксама склаліся пад уплывам вырабаў з Краляўца. Арнаментальныя матывы былі адаптаваны да мясцовых традыцый, пераборнае ткацтва заменена закладным.

Такім чынам, працэсы глабалізацыі падпарадкоўваюць традыцыі сучаснасці, ствараюць новую традыцыйнасць. Жыццяздольнасць любога грамадства залежыць ад захавання яго традыцыйных каштоўнасцей. Як цэласная сістэма ў культуры, рэгулюемая законамі традыцыі, народнае мастацтва ўзнаўляе народна-каштоўнасныя стасункі са светам, прыродай, космасам, якія складаюць маральны фундамент культуры народа. Аднак пытанне традыцыйнасці тых ці іншых з’яў у народным ткацтве і вышыўцы застаецца адкрытым. Культура ўяўляе сабой кангламерат напластаванняў свайго і запазычанага, і выдзяляць асобныя часткі бывае вельмі цяжка. А магчыма гэты сплаў і з’яўляецца нацыянальнай культурай, якая ішла сваім шляхам развіцця і непадобна на ўсе астатнія. Неабходна вывучаць і развіваць гэтую культуру, выкарыстоўваць пры гэтым здабыткі сучасных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналогій. Толькі так нацыянальная культура можа знайсці сваё месца ў сістэме сусветнай культуры, унесці свае каштоўнасці і такім чынам узбагаціцца самой.

1. *Лабачэўская, В.А.* Повязь часоў – беларускі ручнік: альбом / В.А.Лабачэўская. – Мн.: Беларусь, 2002. – 232 с.

2. *Лобачевская, О.А.* Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А.Лобачевская, З.И.Зимина. – Мн.: Бел. навука, 2009. – 279 с.: ил.

3. *Орлова, Э.А.* Культурное многообразие в современном мире: проблемы упорядочения / Э.А.Орлова // Культурное разнообразие, развитие и глобализация: по результатам дискуссий круглого стола. Москва, 21 мая 2003 г. / М-во культуры РФ [и др.]; редкол.: К.Э.Разлогов [и др.]. – М., 2003. – С. 20–30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ